ХАЙ ВЕЧНА ВОЛЯ БУДЗЕ З НАМІ!

# Палітычная праграма руху "Воля"

**Місія: Каб Беларусь і беларусы былі волнымі.** Аднаўленьне, захаваньне і ўмацаваньне сапраўднага суверэнітэту Беларусі, дэмакратыі, падзелу ўладаў і вяршэнства права.

**Мэты – да якой Вольнай Беларусі мы імкнемся:**

**1. Воля – гэта Вольная Беларусь.** Вызваленьне Беларусі з-пад гібрыднай акупацыі. Адхіленьне ад дзяржаўнай улады ў Беларусі асобаў, якія ўтрымліваюць яе неканстытуцыйным шляхам.

**2. Воля – гэта краіна без чужых войскаў.** Ввывад ці выгнаньне за дзяржаўныя межы Айчыны расійскага ваеннага кантынгенту, у тым ліку вывад з тэрыторыі Беларусі расійскай ядравай зброі і пераўтварэньне краіны ў безядравую зону.

**3. Воля – гэта Дэмакратыя**. Вольныя выбары, узнаўленьне дзяржаўных інстытутаў (парлямэнта, судоў) і падзелу ўладаў. Усталяванне вяршынства права.

**4. Воля – гэта Справядлівасць.** Прыцягненьне да адказнасьці ўсіх асобаў, якія ігнаруючы волю беларускага народа, зьдзяйсьнялі злачынствы, у тым ліку дзяржаўныя і вайсковыя, супраць міра і чалавечнасьці. Люстрацыя. Рэабілітацыя і кампенсацыі пацярпелым ад рэпрэсій;

**5. Воля – гэта Бяспека.** Забесьпячэньне і няспыннае ўзмацненьне абароназдольнасьці дзяржавы. Рэфармаваньне ўзброенных сілаў Беларусі на глебе нацыянальнага патрыятызму і ў адпаведнасьці з сучаснымі тэхнічнымі стандартамі НАТА.

**6. Воля – гэта Сяброўства.** Далучэньне Беларусі да Эўрапейскай Уніі як гарантыі трывалага ўстойлівага мірнага суіснаваньня народаў Эўропы. Ініцыяваньне стварэньня Балта-Чарнаморскай Уніі (Інтэрмарыума). Шырокае грамадзкае абмеркаваньне магчымай еўраатлантычнай інтэграцыі Беларусі.

**6. Воля – гэта Нацыя.** Стварэння ўмоваў для росквіту ўсёй нацыянальнай культуры. Наданьне беларускай мове статусу адзінай дзяржаўнай мовы Беларусі, ўжываньне беларускай мовы ва ўсіх сферах дзяржаўнага кіраваньня, у дакументазвароце і адукацыі.

**7. Воля – гэта Дабрабыт.** Развіцьцё рынкавай эканомікі. Прыярытэт прыватнай ініцыятыве, а не ручному кіраванню эканомікай чыноўнікамі.

**Як прыйсці да Волі?**

Прызнаючы факт гібрыднай акупацыі Беларусі Расійскай Федэрацыяй і палітычнымі групоўкамі калябарантаў, і імкнучыся да вызваленьня Радзімы, Рух "Воля" ставіць перад сабой наступныя **задачы**:

- **Стварэньне і папаўненьне Беларускай вызвольнай арміі** – нацыянальнага ўзброенага супраціву дабраахвотнікаў, якія падзяляюць мэту дэакупацыі Беларусі;
- **Дапамога Ўкраіне** і Ўзброеным сілам Украіны ў вызваленьні акупаваных тэрыторый і аднаўленьні краіны;
- **Павелічэньне міжнароднай падтрымкі дэмакратычных сіл Беларусі**.

**Прыярытэты на шляху да Волі:**

**1. Нацыянальная бясьпека, абарона і правапарадак.**

***Ужо сёння:***

- Распрацоўка новай Канцэпцыі нацыянальнай бяспекі і Ваеннай дактрыны з улікам вывучэньня досьведу найлепшых і суадносных сусьветных практык (Швайцарыі, Ізраіля і інш.).
- Арганізацыя і папаўненьне беларускага вызвольнага войска за кошт дабраахвотнікаў, якія падзяляюць мэту дэакупацыі Беларусі.
- Стварэньне вайсковых школ і курсаў падрыхтоўкі падафіцэраў і малодшых афіцэраў для беларускага вызвольнага войска ў тых краінах, у якіх вышэйшыя нацыянальныя органы заканадаўчай і выканаўчай ўлады дадуць на тое згоду пасьля ўхваленага Каардынацыйнай Радай афіцыйнага звароту.
- Распрацоўка адукацыйных праграм для юнакоў з мэтай добрахвотнай патрыятычнай прафесійнай арыентацыі і нацыянальна-арыентаванага вайскога-патрыятычнага выхавання;
- Распрацоўка канцэпцыі падрыхтоўкі вайсковых кадраў вышэйшай кваліфікацыі ў замежных навучальных установах і стратэгіі перамоў з урадамі дзяржаў патэнцыйных саюзнікаў, якія гарантуюць непрызнаньне анэксіі Беларусі Расійскай Федэрацыяй як і непрызнанне Беларусі ў якасці пратэктарата Расіі ці Кітая. Для рэалізацыі задачы падрыхтоўкі вайсковых афіцэрскіх кадраў вышэйшай кваліфікацыі ў існых умовах Каардынацыйнай Радзе і Аб’яднанаму пераходнаму кабінету прапануецца падпісаць дамовы з ўрадамі краін, якія маюць даўнія традыцыі ваеннага стратэгічнага планаваньня і падрыхтоўкі афіцэраў Генеральных штабоў аб падрыхтоўцы афіцэраў вышэйшай кваліфікацыі для Генеральнага штабу Беларускага вызвольнага войска з ліку дзейных старшых афіцэраў Рэспублікі Беларусь ці з ліку ваенных пенсіянераў не дасягнуўшых узросту 55 год з беларускім грамадзянствам

ці беларускага паходжаньня і старшых афіцэраў з ліку дзейных малодшых афіцэраў Узброеных Сіл Рэспублікі Беларусь ці афіцэраў рэзэрву з вышэйшай адукацыяй і вайсковай адукацыяй, атрыманай на ваенных кафедрах. Пасля дэакупацыі Беларусі прапануецца рэфармаваньне Вайсковай акадэміі і стварэньне асобнай Акадэміі Генеральнага штабу Беларусі.

- Рэабілітацыя пастановай Каардынацыйнай рады вайскоўцаў – а таксама супрацоўнікаў праваахоўчых органаў і спецслужбаў, вайсковых пенсіянераў, пенсіянераў Міністэрства ўнутраных спраў, Міністэрства юстыцыі, Пракуратуры і інш. – незаконна зволеных, пазбаўленых пасадаў і/ці вайсковых і спецыяльных званьняў (рангаў) па палітычных матывах пасля ўзурпацыі Лукашэнкам улады ў Беларусі. Аднаўленне вайсковых і спецыяльных званьняў (рангаў) ужо сёння; а ў Вольнай Беларусі – аднавіць іх на службе на ранейшых, або аналагічных пасадах з правам прыярытэтнага прызначэньня на вышэйшую пасаду для аднаўлення даверу да Міністэрства абароны і ўсіх праваахоўных дзяржаўных органаў. У выслугу павінен залічвацца час з моманту незаконнага звальненьня да аднаўленьня на службе.

- Падтырмка дзейнасці з супраца з ухваленым Каардынацыйнай Радай Прадстаўніком па аднаўленні законнасці і правапарадку ў Аб’яднаным пераходным кабінеце.

***У Вольнай Белаурсі:***

- Рэфармаваньне сыстэмы праваахоўных органаў. Стварэньне муніцыпальнай паліцыі і паліцыі грамадзкай бяспекі (аховы грамадзкага парадку). Заканадаўчае замацаваньне прынцыпу выбарнасьці кіраўнікоў муніцыпальнай паліцыі, а таксама кіраўнікоў рэгіянальных упраўленьняў і аддзелаў паліцыі грамадзкай бяспекі.

- Законапаслухмяным вайскоўцам і супрацоўнікам праваахоўных органаў, якія не ўдзельнічалі ў агрэсіўных войнах і ў палітычных рэпрэсіях супраць беларускіх грамадзян, у Вольнай Беларусі прапануецца прыярытэтнае прызначэньне на кіруючыя пасады з наданьнем чарговых і пазачарговых вайсковых званьняў пры наяўнасьці вакансій для аднаўлення даверу грамадзян Беларусі да беларускага войска і ўсіх праваахоўных структур.

- Вайсковым пенсіянерам і пенсіянерам праваахоўных органаў, якія ў час службы ў перыяд прэзыдэнтуры Лукашэнкі (1994-1995) і пасля ўзурпацыі ім непадзеленай дзяржаўнай улады (1996-2026) не здзейснілі злачынствы і не ўдзельнічалі ў рэпрэсіях супраць беларускіх грамадзян, прапануецца вярнуцца на дзейную службу з правам атрыманьня чарговага ці наступнага пазачарговага вайсковага (спецыяльнага) званьня, якое будзе адпавядаць пасадзе, якая ім будзе прапанавана і захаваньня пенсіі пры адначасным грашовым і харчовым утрыманьні за кошт дзяржавы.

- Забесьпячэньне годнага грашовага ўтрыманьня і пенсійнага забеспячэньня для супрацоўнікаў праваахоўных органаў і вайскоўцаў для прадухіленьня карупцыі і павышэньня эфэктыўнасьці дзяйнасьці Узброеных Сіл і праваахоўных органаў дзяржавы.

- Замацаваньне ў нацыянальным заканадаўстве Беларусі права грамадзян на набыцьцё, захаваньне і нашэньне агняпальнай зброі для самаабароны і абароны краіны.

**2. Падтрымка Украіны і беларускіх ветэранаў.**

***Ужо сёння:***

- Падтрымка незалежнасьці і тэрытарыяльнай цэласнасьці Украіны ў яе змаганьні з Расійскай дзяржавай павінна стаць афіцыйнай кансалідаванай пазіцыяй усіх дэмакратычных сіл Беларусі;

- Дыпламатычная падтрымка Украіны на міжнароднай арэне. Актыўны ўдзел у міжнародных форумах з мэтай павелічэньня ваеннай падтрымкі Украіне, пашырэньня і ўзмацнення санкцый супраць агрэсара, а таксама дзеля стварэння дзейнай сыстэмы калектыўнай бяспекі і забеспячэньня трывалага мірнага развіцьця ў рэгіёне.

- Сумесна з партнэрамі арганізацыя гуманітарнай дапамогі для вайскоўцаў, пацярпелых ад вайны і бежанцаў.

- Процідзеяньне інфармацыйным псіхалагічным аперацыям агрэсара, распаўсюд у Беларусі і ў дыяспары праўдзівай інфармацыі аб падзеях ва Украіне.

- Сыстэматычная праца па выбудове трывалых стасункаў з палітычнымі і экспертнымі коламі Украіны, грамадзянскай супольнасцю, для сумеснай стваральнай працы на карысць усіх нацый Міжмор’я.

- Распрацоўка і рэалізацыя праграм па сацыяльнай адаптацыі беларускіх ветэранаў, уключаючы псіхалагічную падтрымку, прафесійную перападрыхтоўку і дапамогу ў працаўладкаванні.

- Публічнае прызнанне і гонар: арганізацыя мерапрыемстваў, накіраваных на ўвекавечваньне памяці пра змагарны досьвед ветэранаў, публічнае прызнаньне іх заслуг, намінацыя і арганізацыя ўзнагароджваньняў.

***У Вольнай Белаурсі:***

- забесьпячэньне годных выплат, ільгот (у тым ліку ільготнага іпатэчнага крэдытаваньня) і пенсій ветэранам баявых дзеяньняў ва Украіне, кампенсацый за медычныя паслугі.

- Фінансавая і сацыяльная дапамога сем'ям ветэранаў. Забесьпячэньне пенсіямі ўдоў і дзяцей загінуўшых (да дасягненьня імі 18 гадовага ўзросту), а таксама заканадаўчае замацаваньне квот на атрыманьне вышэйшай адукацыі для дзяцей загінуўшых і параненых і стыпендый для іх на перыяд навучаньня.

**3. Змаганне з палітычнымі групоўкамі калабарантаў, якія пры расійскай падрымцы усталявалі аўтарытарны рэжым у Беларусі.**

***Ужо сёння:***

- Лабіраваньне ўвядзеньня персанальных санкцый ў дачыненьні ўсіх асобаў,  якія саўдзельнічалі і працягваюць садзейнічаць Расійскай Федэрацыі ў гібрыднай акупацыі Беларусі і ва ўтрыманьні кланам

Лукашэнкі ўлады неканстытуцыйным шляхам;

- Узмацненьне санкцыйнага ціску на прадстаўнікоў бізнесу і кіраўнікоў прадпрыемстваў вайскова-прамысловага комплексу, якія супрацоўнічаюць з рэжымам Лукашэнкі, расьследаваньне схем абыходу санкцый;

- Распрацоўка, арганізацыя і правядзеньне комплексу мерапрыемстваў па супрацьдзеньні акупацыйнаму аўтарытарнаму рэжыму, у тым ліку акцый грамадзкага непадпарадкаваньня;

- Фармаваньне антываеннага руху на тэрыторыі Беларусі, яго каардынацыя з дзейнасцю Руху “Воля” з мэтай стрымліваньня інтэграцыі беларускага і расійскага ваенна-прамысловых комплексаў, а таксама сабатаж паставак зброі,  вайсковай тэхнікі і паліва дзяржаве агрэсару;

- Актыўнае супрацьдзеяньне ўцягванню ваеннаслужачых і цывільных грамадзян Беларусі ў ваенныя дзеяньні падчас магчымай інтэрвенцыі з беларускай тэрыторыі ў адну ці некалькі мяжуючых з Беларусьсю краін Узброеных сіл, Сіл спецыяльных аперацый ці парамілітарных фарміраваньняў Расійскай Федэрацыі і аўтарытарнага рэжыму Лукашэнкі.